Школьнага дома гаспадыня

11.11.2017 - 10:17 Людзі адукацыі

Першая думка, якая ўзнікае пры наведванні гімназіі № 61 сталіцы, — у доме ў цудоўнай гімназічнай сям'і нарэшце з'явілася гаспадыня. Менавіта так хочацца назваць дырэктара гімназіі Ірыну Уладзіміраўну Леўкавец.



На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

большасць вучэбных кабінетаў, адрамантавана і заменена абсталяванне ў харчаблоку, медыцынскім кабінеце. Але самае важнае — за летні сезон 2017 года праведзена цеплавая мадэрнізацыя ўсяго будынка з установкай новых вокнаў і рамонт даху. Гімназія папрыгажэла і змянілася — быццам новы будынак. Менавіта дырэктар гімназіі ініцыіравала правядзенне ўсіх рамонтных работ, пераконвала, даказвала на канкрэтных прыкладах неабходнасць іх правядзення. І была пачута і прадстаўнікамі мясцовай улады, і папячыцельскім саветам, і спонсарамі.

“Мая задача як дырэктара — стварыць максімальна камфортныя ўмовы для дзейнасці цудоўнага калектыву адной з лепшых гімназій не толькі горада, але і краіны”, — адзначае Ірына Уладзіміраўна.

Педагогі гімназіі — творчыя, з вялікім вопытам у розных напрамках адукацыйнай дзейнасці, адкрытыя інавацыям людзі. Пра эфектыўнасць работы педагагічнага калектыву сведчаць шматлікія перамогі выхаванцаў на рэспубліканскай алімпіядзе па вучэбных прадметах, у конкурсе даследчых работ, у інтэлектуальных і творчых конкурсах, спартыўных спаборніцтвах. Па выніках рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах гімназія займае 7-е месца сярод устаноў агульнай сярэдняй адукацыі Мінска. У 2016 годзе выпускнік гімназіі Уладзіслаў Рэентовіч упершыню за ўсю гісторыю цэнтралізаванага тэсціравання атрымаў тры 100-бальныя сертыфікаты. Гэтым летам выпускнік Іван Наркевіч у складзе каманды беларускіх школьнікаў заваяваў бронзавы медаль на Міжнароднай алімпіядзе па геаграфіі, якая праходзіла ў Сербіі. У скарбонцы дасягненняў — прэміі і гранты Мінгарвыканкама, перамогі ў конкурсах педагагічнага майстэрства, выступленні з прэзентацыяй вопыту на розных педагагічных форумах, публікацыі ў галіновым друку педагагічных работнікаў.

У гімназіі створана па-сапраўднаму творчая атмасфера, са сваімі традыцыямі і непаўторным стылем школьнага жыцця, што дазваляе паспяхова вырашаць

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

“Я нічога іншага ў жыцці не ўмею”, — сціпла адказвае дырэктар на пытанне дасведчаных у адміністрацыйна-гаспадарчай сферы пра тое, як ёй удаецца так многа ажыццявіць у пераўтварэнні гімназіі. Але за гэтай сціпласцю — больш за 20 гадоў работы ў сістэме адукацыі, з іх10 — на пасадзе дырэктара.

Родам з невялікага мястэчка на Гомельшчыне, Ірына Уладзіміраўна Леўкавец скончыла Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка па спецыяльнасці “Гісторыя” і пачала прафесійны шлях у адной са школ сталіцы. Потым працягнула сваю адукацыю ў магістратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Маладога таленавітага настаўніка заўважылі як добрага арганізатара, і ў 27 гадоў Ірына Уладзіміраўна стала намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце, а ўсяго праз пяць гадоў — дырэктарам.

“Люблю гісторыю, а яшчэ больш люблю працаваць з дзецьмі. З’яўляючыся кіраўніком, не хачу страціць сябе як настаўніка”, — прызнаецца Ірына Уладзіміраўна. Работа ў 5-х класах дазваляе ёй знаёміцца з самымі юнымі гімназістамі, убачыць іх здольнасці і патэнцыял, што дапамагае эфектыўна каардынаваць дзейнасць педагогаў на шляху ін-тэлектуальнага і творчага развіцця навучэнцаў.

Ужо стаўшы дырэктарам, Ірына Уладзіміраўна адчула вострую патрэбу ў развіцці кампетэнцый у галіне кіравання, таму скончыла Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі па спецыяльнасці “Менеджмент у сферы адукацыі”. Імкненне да самаразвіцця, самаадукацыі — рыса, уласцівая І.У.Леўкавец, якая не дазваляе спыняцца на дасягнутым, з’яўляецца імпульсам для асваення і прымянення сучасных тэхналогій у галіне адукацыі і менеджменту.

Патрабавальная да сябе, І.У.Леўкавец з такім жа патрабаваннем быць адкрытымі да інавацый ставіцца і да іншых. Сваю задачу бачыць у забеспячэнні адпаведных умоў. Так, адным з першых крокаў на шляху мадэрнізацыі гімназіі было

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

рэальных дасягненняў эфектыўна рэалізоўвае патэнцыял калектыву. Уменне знаходзіць агульную мову з настаўнікамі, дзецьмі і бацькамі дазволілі Ірыне Уладзіміраўне стварыць камфортны псіхалагічны клімат у калектыве, паспяхова развіваць педагагічную і дзіцячую творчасць. За добрасумленную працу і высокія дасягненні ў прафесійнай дзейнасці Ірына Уладзіміраўна адзначана ганаровым званнем “Выдатнік адукацыі”, граматамі і падзякамі Міністэрства адукацыі, камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама. Але самая галоўная ўзнагарода для дырэктара — поспехі вучняў і настаўнікаў.

Алена РАБАВА,
намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце гімназіі № 61 Мінска,
кандыдат педагагічных навук.

Еще материалы рубрики



Фея і яе Золушкі

07.02.2023



Таямніцы сямейнага куфра

03.02.2023

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

Организация декады предметов естественно-научного цикла в школе: игра «Знатоки естественных наук»

У гімназіі № 1 Ваўкавыска вялікую ролю адводзяць музейнай педагогіцы

Вучні сталічнай школы № 182 лічаць кітайскую мову перспектыўнай

Учащиеся минской гимназии № 39 завоевали гран-при фестиваля инженерных профессий

Более ста дошколят стали участниками театральной постановки к 9 Мая в Ошмянах

АВТОРСКИЕ КОЛОНКИ



ИГОРЬ ГРЕЧКО

МОЦНЫЯ СЕМ'І



ЕКАТЕРИНА ДУБИНСКАЯ

НАСТОЯЩЕЕ СЛОВО



ЕКАТЕРИНА МОТЕВИЧ

РАБОТА АД СЭРЦА

©2014-2024 Редакционно-издательское учреждение «Издательский дом «Педагогическая пресса»

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее